Такім чынам, да гэтага часу цяжка гаварыць аб адзінай канцэпцыі культуры. Найбольш сфарміраваныя — культура як другая прырода, створаная чалавекам і стварыўшая яго, і культура як дэтэрмінаваныя паводзіны чалавека, прытрымліванне прынятага ў дадзеным грамадстве і ў дадзены час культурнага ўзору.


1. *Бердяев Н.А.* Философия неравенства.— М., 1990.

2. *Иванчук Н.В.* Потребности социальной личности.— М., 1986.

3. Крукоўскі М.І. Філасофія культуры. — Мн., 2000.

4. *Межуев В.Н.* Культура и история.— М., 1997.

5. *Орлова Э.А.* Введение в социальную и культурную антропологию.—М., 1994.

6. *Тайлер Э.Б.* Первобытная культура.— М., 1989.

7. *Талызина Л.Н.* Влияние духовной культуры на формирование потребностей студенческой молодежи: Дис. ... Л., 1988.

8. *White L.A.* The concent of Culture // American Anthropologist.— Washington, 1959.— Vol.61.— P.227—251.

9. *Фохт-Бабушкин Ю.У.* Искусство и духовный мир человека.— М., 1982.



**П.Р. Ігнатовіч,**
*дацэнт*


## КУЛЬТУРНАЯ ПАЛІТЫКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ НА ЭТАПЕ ТРАНСФАРМАЦЫІ ГРАМАДСТВА

Чалавецтва ўступіла ў трэцяе тысячагоддзе. Папярэднія два тысячагоддзі былі гадамі гісторыі, звязанай з нараджэннем Іісуса Хрыста, нараджэннем новай эры, новай веры, а гэта значыць, і агромністага пласта культуры, звязанай з хрысціянствам, якая ўзбагаціла агульначалавечую культуру. Апошняе дзесяцігоддзе было дзесяцігоддзем найвялікшых змен геапалітычнага характару. З палітычнай карты свету знікла адна з супердзяржаў — СССР. А на яе былых прасторах з'явіліся самастойныя дзяржавы.

Пасля распаду Савецкага Саюза ўтварылася незалежная, суверэнная дзяржава Рэспубліка Беларусь.

Працэс гэты неаднародны, неадназначны, часам балючы, тым не менш існуе аб'ектыўна і таму патрабуе сур'ёзнага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падыходу. Ён уяўляе сабой шматгранную сістэмную трансфармацыю грамадства, і яго вынікі ў велізарнай ступені залежаць ад культуры духоўнай, палітычнай, маральнай, эканамічнай, міжэтнічных і міжканфесійных адносін. У канчатковым выніку наша будучыня залежыць ад таго, як і наколькі хутка мы пройдзем адрэзак гісторыі, названы перыядам трансфармацыі.

Сусветная практыка і айчынны вопыт сведчаць аб выключнай ролі рэгулявання культурнага жыцця ў любой краіне. Асабліва гэта тычыцца пераломных момантаў грамадскага развіцця. Адразу трэба зазначыць: гэтае пытанне не такое простае, як можа падацца на першы погляд. Аўтар прытрымліваецца меркавання, што рэгуляванне, кіраванне працэсамі ў сферы культуры маюць аб'ектыўны і заканамерны характар. Аднак ёсць і іншы погляд. Ён распаўсюджаны перш за ўсё сярод саміх дзеячаў, творцаў культуры, якія часам зусім катэгарычна адмаўляюць магчымасць "умяшання" дзяржавы або якіх бы то ні было іншых інстытутаў у такую тонкую і далікатную справу, як культурная творчасць. Яны вядуць барацьбу супраць усялякіх бюракратычных або ідэйных абмежаванняў, за свабоду мастака ад усяго, што скоўвае яго творчасць.

Сцвярджаецца, што па прычыне асаблівай ролі творчага пачатку культуры яна звязана з індывідуальнай дзейнасцю пісьменнікаў, музыкантаў, мастакоў, якая не ўкладваецца ў межы рэгламентацыі. Такой жа пазіцыі прытрымліваюцца некаторыя культуролагі.

Тым не менш вядома, што гістарычна існавалі і існуюць розныя інстытуты, якія рэгулююць культурнае жыццё. Аб гэтым сведчыць шэраг арганізацый, што дзейнічаюць у рамках Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Перш за ўсё гэта ЮНЕСКА. Па яе ініцыятыве ААН аб'явіла аб сусветным дзесяцігоддзі культуры, 1988–1997 гг. Галоўная мэта гэтай акцыі заключалася ў тым, каб асэнсаваць шляхі забеспячэння насельніцтва культурнымі каштоўнасцямі, вызначыць месца ў эканамічным і тэхнічным развіцці пры дапамозе ўліку культурнага аспекту ва ўсіх сацыяльна-эканамічных і тэхнічных праектах развіцця грамадства. Гэтыя праекты садзейнічаюць адраджэнню і ўзбагачэнню культурнай самабытнасці народаў, адлюстроўваюць іх погляды на свет і ўяўленні пра сябе; пашыраюць ўдзел людзей у культурным жыцці, развіваюць міжнароднае культурнае супрацоўніцтва.



РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

Трэба сказаць, што сфера культуры, па-першае, разумеецца ў шырокім і ў вузкім сэнсе. Па-другое, структурна, па лініі дзяржаўнага і галіновага падпарадкавання, а значыць, і кіравання, на сённяшні дзень яна недастаткова распрацавана. У выніку ў краіне існуюць некалькі міністэрстваў і ведамстваў, якія маюць непасрэднае дачыненне да сферы культуры. Гэта, безумоўна, перш за ўсё Міністэрства культуры. Але гэта і Міністэрства адукацыі, і Дзяржкамітэт па друку, у пэўнай меры Міністэрства спорту і турызму, сістэма тэле-, радыёкамунікацый і інш. Сфера культуры ў значнай ступені залежыць ад дзейнасці міністэрстваў фінансаў, эканомікі, працы і інш.

Безумоўна, Міністэрства культуры адыгрывае вырашальную ролю, і пры аналізе дадзенай праблемы будзем зыходзіць перш за ўсё з гэтай пасылкі. Пералічаныя акалічнасці ўжо самі па сабе з'яўляюцца важным аргументам на карысць аб'ектыўнай і заканамернай неабходнасці кіравання сферай культуры.

У развіцці культурнага працэсу ўзнікаюць сітуацыі паміж тэндэнцыямі да цэнтралізацыі культурнай дзейнасці з боку дзяржавы і яе дэмакратызацыяй, якой патрабуюць няўрадавыя арганізацыі. Але ўмяшанне ўрадавых органаў у работу культурных арганізацый і груп часта проста неабходнае, бо без дзяржаўнай падтрымкі яны не могуць вытрымаць розных цяжкасцей, не толькі фінансавых, але і прававых, палітычных і інш. Разам з тым умяшанне можа ствараць пагрозу залежнасці культурнай дзейнасці ад улады, кіруючых колаў, што можа прывесці да дэфармацыі культурнага жыцця.

Гісторыя дае шмат прыкладаў, калі дзяржава і царква, з аднаго боку, былі галоўнымі інстытутамі, якія падтрымлівалі навуку, літаратуру, мастацтва, а з другога – яны ж забараняли тыя накірункі або адмаўлялі ў пратэжыраванні і апякунстве творцам, якія або пярэчылі "грамадскім нормам", або наносілі ўрон дзяржаве ці царкве.

На больш позніх этапах функцыі рэгуляцыі сферы культуры пачынаюць падпарадкоўвацца рынку. Але прававыя прынцыпы нязменна карэкціравалі рыначную стыхію. Да таго ж, сфарміраваліся іншыя органы, інстытуты і формы рэгуляцыі культурнай жыццядзейнасці: фонды, спонсарства, мецэнацтва, патранаж, розныя прэміі, прысваенне званняў, арганізацыя акадэмій і інш.

Дзяржава – асобы сацыяльны інстытут, які аказвае ўплыў на культуру. І хаця сутнасць, дынаміка і лёс дзяржавы не супадаюць з дынамікай культуры, у кожным грамадстве дзяржава

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў тым ці іншым аб'ёме падтрымлівае сферу культуры як бюджэтным фінансаваннем, так і спецыяльным заканадаўствам або спецыяльнай палітыкай. Але ажыццяўленне прынцыпаў плюралізацыі і дэмакратызацыі, іншыя фактары прыводзяць да таго, што падтрымка з боку дзяржавы непазбежна абмяжоўваецца. Таму культура ў значнай ступені функцыянуе ва ўзаемадзеянні з іншымі сферамі дзейнасці і рэгуляцыі, перш за ўсё з гаспадарчай сферай, рынкам, у тым ліку і рынкам культуры.

Такім чынам, дзяржава з'яўляецца тым сацыяльным інстытутам, тым органам, які фарміруе і праводзіць у жыццё палітыку ў галіне культуры.

Падзеі культурнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь у працэсе трансфармацыі грамадства выклікаюць глыбокія змены ўнутранага свету чалавека, яго сацыякультурных пазіцый, каштоўнасных арыентацый. Яна суправаджаецца разбурэннем ранейшай парадыгмы каштоўнасцей, калі многія з іх ва ўспрыманні значнай колькасці людзей мяняюць знак плюс на знак мінус. Прыярытэтнае значэнне пачынае набываць этнічная і рэлігійная ідэнтыфікацыя асобы.

Кожны народ праз успрыманне і пераўтварэнне культурнай спадчыны сусветнай супольнасці выпрацоўвае аптымальную сістэму каштоўнасцей, стварае выхаваўчы ідэал, які адпавядае яго менталітэту, яго традыцыйным уяўленням аб дасканалай асобе. Народны ідэал увасабляе ўсё багацце гістарычнай спадчыны этнасу, яго адметны менталітэт.

Культурная палітыка ў нашай краіне будуецца на аснове Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, артыкул 51 якой дэкларуе правa грамадзян на ўдзел у культурным жыцці (3).

Галоўнымі задачамі культурнай палітыкі павінны стаць уздым нацыянальнай самасвядомасці беларускай нацыі, стварэнне ў краіне ўмоў, пры якіх мог бы свабодна выяўляцца яе нацыянальны характар. Гэта, у сваю чаргу, дазволіць прадстаўнікам іншых этнасаў, якія жывуць на тэрыторыі Беларусі, плённа развіваць сваю культуру, выяўляць нацыянальныя асаблівасці.

Але права чалавека на тое, каб свабодна ўдзельнічаць у культурным жыцці, самога па сабе мала. Культурную дзейнасць трэба яшчэ і стымуляваць. Сусветная супольнасць ужо ўсвядоміла, што “культурнае развіццё павінна стаць клопатам і абавязкам сучаснай дзяржавы і ўсіх іншых інстытутаў, якія прымаюць рашэнні аб стратэгіях, праграмах і праектах грамадскага развіцця” (3).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь абвяшчае, што правa беларускага народа карыстацца культурай забяспечваецца агульнай даступнасцю каштоўнасцей айчыннай і сусветнай культуры, якія знаходзяцца ў дзяржаўных і грамадскіх фондах, а таксама развіццём сеткі культурна-асветных устаноў. Канстытуцыяй гарантуецца свабода мастацкай, навуковай, тэхнічнай творчасці і выкладання. Дзяржава садзейнічае развіццю культуры, навуковых і тэхнічных даследаванняў на карысць агульных інтарэсаў.

Правы грамадзян у галіне культуры павінны забяспечвацца правядзеннем культурнай палітыкі ў грамадстве. Палітыка ў галіне культуры – гэта сістэма юрыдычна-прававых, эканамічных, сацыяльна-палітычных, арганізацыйных і іншых мерапрыемстваў, накіраваных на фарміраванне пажаданай для грамадства і задавальняючай асобу, сацыяльныя слаі і групы культурнай сітуацыі, якая стварае ўмовы для плённага гарманічнага развіцця культуры і асобы, аптымізацыі сацыяльных адносін у галіне культуры.

Натуральна, фарміруюць і ажыццяўляюць культурную палітыку ў любым грамадстве, у нашым у тым ліку, перш за ўсё дзяржава, яе органы ва ўзаемасувязях з іншымі сацыяльнымі інстытутамі, грамадскімі і творчымі аб'яднаннямі, саюзамі і рухамі. У Беларусі склалася мадэль кіравання культурай, заснаваная па моцнай урадавай адміністрацыі, якая не толькі падтрымлівае культуру фінансава, але і каардынуе работу іншых урадавых і няўрадавых структур (6).

Асноўнымі мэтамі і задачамі культурнай палітыкі з'яўляюцца наступныя:

— асэнсаванне ролі культуры, яе месца і стану ў жыцці грамадства;

— фарміраванне сродкамі культуры інтэлектуальных і маральных асноў стварэння дэмакратычнай прававой дзяржавы;

— стварэнне рэальных сацыяльна-палітычных і эканамічных умоў для станаўлення і развіцця на тэрыторыі рэспублікі нацыянальнай культуры, захавання і папулярызацыі беларускай нацыянальнай спадчыны;

— стварэнне ўмоў для адраджэння і развіцця нацыянальных традыцый, культур іншых этнасаў, якія жывуць на тэрыторыі рэспублікі;

— ажыццяўленне рацыянальнай моўнай палітыкі, што забяспечвае высокую культуру беларускай мовы, стварэнне ўмоў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

для развіцця моў нацыянальных меншасцей, якія жывуць на тэрыторыі рэспублікі.

Гэтага можна дасягнуць праз:

— ажыццяўленне пераемнасці і непарыўнасці традыцый, апоры на фундаментальныя агульначалавечыя каштоўнасці, культурную і гістарычную спадчыну;

— гуманізацыю, умацаванне асобаснага зместу сацыяльнай і культурнай дзейнасці;

— раўнапраўнае развіццё культур прадстаўнікоў усіх этнасаў, якая жывуць у Беларусі;

— навуковую распрацоўку праблем культуры, творчай дзейнасці навуковых і навучальных устаноў, творчых аб'яднанняў і саюзаў па прагназаванні развіцця беларускай культуры;

— дэмакратызацыю кіравання культурай, умацаванне самадзейных асноў культурнай дзейнасці, распрацоўку і ажыццяўленне новых падыходаў, якія ўлічваюць сучасныя тэндэнцыі і накірункі яе развіцця;

— устанаўленне і развіццё шырокіх знешніх сувязей з замежнымі партнёрамі, перш за ўсё ў рамках Саюза Беларусі і Расіі і Саюза Незалежных Дзяржаў.

Адна з важнейшых задач заключаецца ў гарманізацыі ўзаемаадносін паміж культурамі розных этнасаў, якія складаюць беларускі народ.

Палітыка дзяржавы ў галіне культуры заключаецца перш за ўсё ў стварэнні эканамічных і арганізацыйна-прававых умоў развіцця культуры, захаванні і забеспячэнні эфектыўнай дзейнасці яе прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў, падрыхтоўцы і сацыяльнай абароне работнікаў культуры, дзеячаў мастацтва, у стымуляванні аматарскіх аб'яднанняў і самадзейнай народнай творчасці. Дзяржаўныя органы ва ўзаемадзеянні з грамадскімі арганізацыямі павінны забяспечваць развіццё культуры і несці адказнасць за духоўнае, маральнае, эстэтычнае выхаванне грамадзян — дэкларуецца ў раздзеле "Абавязкі дзяржавы ў галіне культуры" Закона аб культуры. Яны абавязаны ўдасканальваць сістэму сацыяльных, арганізацыйна-прававых і эканамічных гарантый развіцця культуры і мастацтва, ствараць неабходныя ўмовы для далучэння грамадзян да нацыянальнай і сусветнай культурнай спадчыны. Неабходна фарміраваць сістэму прадпрыемстваў і ўстаноў, выдзяляць неабходныя сродкі, забяспечваць правядзенне навуковых даследаванняў і распрацоўку навуковых праектаў у галіне культуры, падрыхтоўку

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

кваліфікаваных кадраў, ствараць гарантыі і стымулы мастацкай творчасці, захавання традыцый культуры ( фальклор, народныя промыслы і рамёствы), выкарыстання дасягненняў культуры.

Гэтыя мэты, задачы і прыярытэты арганічна ўпісваюцца ў палажэнні культурнай палітыкі, сфармуляваныя ЮНЕСКА на Міжнароднай канферэнцыі па палітыцы ў сферы культуры і інтарэсах развіцця (Стакгольм, 30 сакавіка – 2 красавіка 1998 г.). У адпаведнасці з выпрацаванай на канферэнцыі канцэпцыяй пэўныя эканамічныя дасягненні магчымыя якраз пад уздзеяннем культурных з'яў. “У канчатковым выніку развіццё можа быць вызначана з пункту гледжання культуры, і росквіт культуры з'яўляецца вышэйшай мэтай развіцця” (4). Канферэнцыя рэкамендавала дзяржавам – членам ЮНЕСКА – у якасці мэт развіцця:

— пашырэнне маштабаў палітыкі ў сферы культуры і пераўтварэнне яе ў адзін з цэнтральных кампанентаў палітыкі ў галіне развіцця;

— вылучэнне большага аб'ёму сродкаў на развіццё культуры;

— актывізацыю творчасці ў галіне культуры ў якасці фактару ўстойлівага развіцця;

— перагляд палітыкі і практычнай дзейнасці ў сферы зберажэння спадчыны для ўмацавання творчасці і садзейнічання развіццю індустрыі культуры;

— забеспячэнне ўстойлівасці культурнай разнастайнасці ўнутры інфармацыйнага грамадства і на яго карысць.

Безумоўна, гэта вельмі складаны, смелы, аптымістычны стратэгічны падыход на ўзроўні міжнароднай супольнасці. З яго вынікае, што да той пары, пакуль не будзе з боку дзяржавы і ўплывовых недзяржаўных органаў і арганізацый разумення вызначальнай ролі культуры ў адносінах да іншых сфер, у тым ліку і эканомікі, будзе захоўвацца рэшткавы прынцып фінансавання культуры, а ў эканоміцы не адбудзецца значных станоўчых перамен.

Асноўныя накірункі культурнай палітыкі нашай дзяржавы былі сфармуляваны ў шэрагу заканадаўчых актаў. Гэта перш за ўсё Закон аб культуры. Трэба зазначыць, што ён распрацоўваўся і прымаўся ў 1991 г. у БССР, якая ўваходзіла ў склад Савецкага Саюза. Гэта быў першы закон аб культуры на ўсёй прасторы СССР. Яго прыняцце з'яўляецца сведчаннем увагі з боку дзяржавы да праблем культуры. Пасля гэтага ўжо ў суверэннай Рэспубліцы Беларусь быў прыняты цэлы шэраг заканадаўчых актаў. Трэба

РЭПОЗІТОРИЙ БГУКИ

падкрэсліць, што заканатворчая дзейнасць наогул, у тым ліку або, можа, нават перш за ўсё ў галіне культуры, і аб'ектыўна, і суб'ектыўна звязана з вялікімі цяжкасцямі. Аб гэтым сведчыць прызнанне старшыні камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі. Ён падкрэслівае, што заканатворчая работа ў галіне культуры ідзе, шчыра кажучы, вельмі складана. Чаму? Таму што законы, якія рэгулююць адносіны ў той або іншай галінах культуры, без мер сацыяльнай падтрымкі з боку дзяржавы становяцца па сутнасці дэкларатыўнымі. А вось адстаяць артыкулы, у якіх ідзе гаворка аб сацыяльнай падтрымцы, даволі складана (1).

І тым не менш, прасачыўшы дынаміку заканатворчай дзейнасці ў галіне культуры, можна зрабіць выснову аб тым, што за 90-я гады ў краіне ў гэтым напрамку зроблена нямала. Услед за Законам аб культуры ў 1992 г. быў прыняты закон "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны", у 1995 г. – закон "Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь", у 1996 г. – законы "Аб аўтарскім праве і сумежных правах", "Аб музеях і музейных фондах Рэспублікі Беларусь". У 1997 г. быў прыняты закон "Аб далучэнні Рэспублікі Беларусь да Бернскай канвенцыі аб ахове дзяржаўных і мастацкіх твораў", у 1998 г. – закон "Аб ліцэнзаванні гастрольна-канцэртнай дзейнасці", у 1999 г. – закон "Аб народным мастацтве, народных промыслах".

Сведчаннем увагі дзяржаўных органаў да культуры з'яўляецца і тое, што ў чэрвені 1998 г. адбыліся парламенцкія слуханні па пытаннях развіцця культуры ў Рэспубліцы Беларусь.

Распрацоўка і ажыццяўленне культурнай палітыкі не могуць праводзіцца без сур'ёзных навуковых прагнозаў, іх абгрунтавання. У гэтым рэчышчы ў Беларусі ў апошні час зроблены значныя крокі. Вось толькі некалькі прыкладаў. У 1997 г. распачата распрацоўка рэспубліканскай комплекснай праграмы "Культура", фінансуемай з рэспубліканскага бюджэту. Галоўнай яе мэтай з'яўляецца распрацоўка навукова-метадалагічных асноў паглыбленага даследавання беларускай культуры, фактараў, якія вызначаюць яе сучасныя формы і перспектывы развіцця. Праграма прадугледжвае вывучэнне культурных патрэбнасцей і рынку культурных даброт грамадства ў цэлым, розных яго слаёў і груп. Знаходзяць сваё адлюстраванне пытанні забеспячэння галіны высокакваліфікаванымі кадрамі, распрацоўкі і ажыццяўлення культурнай палітыкі ў новых умовах. Заказчыкам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэтай праграмы выступае ад імя дзяржавы Міністэрства культуры. Выканаўцамі – супрацоўнікі навукова-даследчых устаноў і ВНУ рэспублікі, у тым ліку Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры. Галаўной арганізацыяй-выканаўцам з'яўляецца Беларускі інстытут праблем культуры (БелІПК). Праграма носіць шматгранны, комплексны характар.

На працягу апошніх гадоў у Інстытуце сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук вядуцца даследаванні ў сферы сацыядынамікі культуры ў яе суадносінах з працэсамі засваення духоўных каштоўнасцей і нормаў рознымі этнанацыянальнымі, сацыяльна-прафесійнымі, сацыяльна-дэмаграфічнымі, канфесійнымі групамі. У рэчышчы гэтай праблемы сфармулявана комплексная навуковая тэма кафедры сацыялогіі і культуразнаўства Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры, якая завершана ў 2000 г.

Значныя даследаванні розных аспектаў культуры праведзены іншымі навуковымі цэнтрамі. Напрыклад, Інстытутам сацыяльна-палітычных даследаванняў пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь праведзена комплекснае даследаванне праблем моладзі. Цэнтрам сацыялагічных даследаванняў Беларускага дзяржаўнага універсітэта вывучаліся каштоўнасныя арыентацыі студэнцтва. Каардынацыйным саветам па справах нацыянальных меншасцей пры Кабінеце Міністраў Рэспублікі Беларусь сумесна з Міністэрствам культуры і адукацыі, Рэспубліканскім цэнтрам нацыянальных культур, Міжнароднай акадэміяй вывучэння нацыянальных меншасцей у маі 1996 г. праведзена навукова-практычная канферэнцыя "Нацыянальныя меншасці Беларусі: шляхам супрацоўніцтва і згоды". Матэрыялы канферэнцыі выдадзены ў трох кнігах. У лютым 1997 г. у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры праведзена рэспубліканская навукова-метадычная канферэнцыя "Культуралагічная падрыхтоўка студэнтаў у сістэме ВНУ". Матэрыялы канферэнцыі выдадзены асобным зборнікам. А ў 1999 г. адбылася канферэнцыя "Стандарты вышэйшай культуралагічнай і мастацкай адукацыі: тэарэтычна-метадалагічныя аспекты". Шэраг даследчыкаў у рамках даследчыцкіх праграм або паводле асабістага плана ў апошні час падрыхтавалі значныя работы, у тым ліку дысертацыйныя, у якіх дасканала аналізуюцца тыя ці іншыя бакі праблем культуры. Сярод іх прарэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры прафесар А.І.Смолік, які ў снежні 1999 г. абараніў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

доктарскую дысертацыю па тэме "Дзейнасць сацыякультурных інстытутаў Беларусі ў посткатастрофным соцыуме." У 1999 г. у Беларускім інстытуце праблем культуры яго супрацоўніцай І.Б.Багачовай выдадзена манаграфія пад назвай "Адукацыйны стандарт у сістэме вышэйшай музычнай адукацыі." У манаграфіі разглядаюцца актуальныя пытанні сучаснай вышэйшай музычнай адукацыі ў кантэксце стандартызацыі. Даследаванне падрыхтавана ў рамках дзяржаўнай навуковай праграмы "Культура (1997—1998 гг.)" і абапіраецца на Канцэпцыю прафесійнай адукацыі ў галіне мастацтва ў Рэспубліцы Беларусь.

На аснове абагульнення вынікаў даследаванняў рознымі навуковымі падраздзяленнямі было ўнесена шмат прапаноў у заканадаўчыя і выканаўчыя органы дзяржавы па ўдасканаленні кіравання сацыяльнай сферай, галінамі культуры, адукацыі, выхавання моладзі.

Як сцвярджаюць даследчыкі, дзяржаўная палітыка Рэспублікі Беларусь у галіне культуры на сучасным этапе ўяўляе прадуманы і адказны выбар мэт і прыярытэтаў, стварэнне механізмаў іх ажыццяўлення і мэтанакіраванае выдзяленне рэсурсаў.

І ўсё ж яна мае супярэчлівы характар. А гэта, у сваю чаргу, выклікае як станоўчыя, так і адмоўныя тэндэнцыі.

Сведчаннем таму з'яўляецца стан культуры наогул, а таксама асобных яе галін і накірункаў. Калі разгледзець развіццё культуры ў апошнія дзесяць гадоў, то можна зрабіць выснову аб тым, што, нягледзячы на эканамічныя цяжкасці краіны, культура выжывае, як кажуць, "не дзякуючы", а "насуперак". "Можна канстатаваць факт, што творчы патэнцыял у галіне культуры мы захавалі, — падкрэсліў намеснік міністра культуры В.К.Гедройц, — гэта можна прасачыць па тых мерапрыемствах, што ладзяцца ў краіне ў кожнай вобласці, амаль у кожным раёне. І праходзяць яны на даволі высокім узроўні" (1). Беларусь актыўна і паспяхова прымае ўдзел у міжнародных мастацкіх конкурсах і фестывалях. Гонарам рэспублікі сталі традыцыйныя музычныя фестывалі "Славянскі базар" у Віцебску, "Залаты шлягер" у Магілёве, кінафестываль "Лістапад" у Мінску і інш. У краіне штогод праходзяць сотні аглядаў, конкурсаў, выставак, фестываляў, свят мастацтваў.

Значнай з'явай, якая стымулюе развіццё культуры, стала заснаванне фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва. Сродкі фонду ствараюцца за кошт асігнаванняў з рэспубліканскага бюджэту, дабрачынных узносаў і рэзервовага фонду Прэзідэнта. За час існавання на рахунку фонду

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шмат вельмі карысных спраў. Дзейнасць фонду ўключае featureнабаковую дапамогу творцам і скіравана не толькі на падтрымку лепшага, перспектыўнага ў культуры, але і на пошук, станаўленне і развіццё таленавітай моладзі. Дзякуючы фонду, выдзяляюцца грашовыя гранты, накіраваныя на выплату ганарараў, забеспячэнне выездаў творцаў розных відаў мастацтва для ўдзелу ў міжнародных конкурсах, на стажыроўкі і інш.

Хаця дзяржава і дэкларуе прыярытэтны характар культуры, але неабходна стварэнне юрыдычных, матэрыяльна-тэхнічных і фінансавых умоў для яе развіцця. Шмат чаго робіцца на самай справе. У той жа час у культуры назіраюцца многія негатыўныя тэндэнцыі, напрыклад недастатковае дзяржаўнае фінансаванне. Ведамствы і прафсаюзы ў многіх выпадках наогул спынілі фінансаванне культуры. У выніку скарачаюцца штаты, многія ўстановы закрываюцца.

Законам аб культуры дзяржава гарантавала штогадовае фінансаванне культуры ў памеры не менш за 3% расходнай часткі бюджэту, на самай справе дзяржаўнае фінансаванне ні разу не дасягнула гэтага памеру. Калі дзяржаўнае фінансаванне ў 1991 г. склала 0,8%, у 1996 – 1,3, а ў 1998 г. – 1,4, то у 1999 г. – толькі 1,15%. Відавочна, што бюджэтных сродкаў на забеспячэнне дзейнасці ўстаноў культуры пры існуючым узроўні фінансавання ні зараз, ні ў будучым не будзе хапаць (5). У работнікаў культуры вельмі нізкая заработная плата.

На сённяшні дзень заканадаўства ў сферы культуры не сістэматызавана, не адменены і шэраг устарэлых нарматыўных дакументаў. Існуюць супярэчнасці як у самім заканадаўстве, так і паміж нормамі права і практыкай іх прымянення. Некаторыя грамадскія адносіны ў сферы культуры наогул не ўрэгуляваны. Напрыклад, у сферы развіцця мастацкага рынку, кіна-, відэатворчасці і пракату, спонсарскай і мецэнацкай дзейнасці і інш. Уладкаванню заканадаўства ў сферы культуры магло б паспрыяць прыняцце кодэкса законаў аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь.

Улічваючы разнастайнасць адносін у сферы культуры, усе змены і дапаўненні ў заканадаўстве павінны знайсці адлюстраванне ў рэгламентацыі адносін уласнасці, падаткаабкладання, бюджэтнага рэгулявання, працоўнага, грамадскага, мытнага заканадаўства, аховы і выкарыстання помнікаў гісторыі і культуры, узаемадзеяння дзяржаўных органаў з грамадскімі аб'яднаннямі культурнага накірунку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Патрабуе юрыдычнага рэгулявання працэс станаўлення беларускага рынку мастацтваў. Як любы працэс, што толькі пачынае развівацца, ён носіць стыхійны характар і спараджае цэлы спектр культурных і сацыяльна-эканамічных праблем. Нарматыўныя дакументы ў гэтай сферы павінны быць накіраваны на стымуляванне пераводу яго ў пэўныя арганізацыйныя формы, станаўленне і фарміраванне цывілізаваных суб'ектаў рыначных адносін у сферы культуры і мастацтва (галерэй, калекцыянераў, імпрэсарыо, спецыялізаваных СМК). Патрабуюць свайго вырашэння праблемы ўвозу і вывазу твораў мастацтва, абароны аўтарскіх правоў і інш.

Выступаючы на парламенцкіх слуханнях па пытаннях развіцця культуры (чэрвень 1998 г.), міністр культуры падкрэсліў: "Аднак не змяншаецца ўплыў адмоўных тэндэнцый, уласцівых сённяшняму стану нацыянальнай культуры. Да іх ліку трэба аднесці, напрыклад, недастатковае бюджэтнае фінансаванне культуры, штогадовае зніжэнне ўзроўню аплаты працы тых, хто заняты ў сферы культуры, адносна іншых галін народнай гаспадаркі, адсутнасць ільготнага падаткаабкладання ў гэтай галіне, скарачэнне камплектавання бібліятэк усімі відамі друкаванай прадукцыі, адставанне ў будаўніцтве і рэканструкцыі шэрага культурных аб'ектаў, не адпаведную часу запаволеную распрацоўку неабходных заканадаўчых і нарматыўных дакументаў".

Важнымі праблемамі з'яўляюцца каардынацыя дзейнасці ў сферы культуры, усталяванне рацыянальных, аптымальных суадносін паміж органамі культуры на рэспубліканскім і мясцовым узроўнях (2).


1. *Гедройц В.* Не "дзякуючы", а "насуперак" //Культура. — 1999. — № 12.

2. *Каманава Т., Філіповіч А.* Не разводзячы рукамі // Культура. — 1999. — № 17.

3. *Канстытуцыя* Рэспублікі Беларусь. — Мн., 1997. — С. 15.

4. *Міхневіч А.Я.* Краевугольны камень устойлівага развіцця // Культура. — 1999. — № 22—23.

5. *Сасноўскі А.* Прыярытэты вынікаюць з будучыні // Рэспубліка. — 1999. — 16 сак.

6. *Смолік А.І.* Сацыяльна-культурная сітуацыя канца XX стагоддзя // Культура Беларусі: навуковы пошук моладзі. — Мн., 1999. — С. 11.




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ